*Л. В. Мікалаева*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі

*L. Mikalayeva*
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics

**УДК 930(476):[327+7.072(470)]**

# ПОГЛЯД НА ПРАБЛЕМАТЫКУ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ. У ПРАЦАХ РАСІЙСКІХ САВЕЦКІХ ГІСТОРЫКАЎ

# THE LOOK AT THE PROBLEMS OF THE FOREIGN POLICY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE END OF THE XIV – FIRST HALF OF THE XVI CENTURIES IN THE WORKS OF RUSSIAN SOVIET HISTORIANS

*У артыкуле прааналізаваны найважнейшыя працы расійскіх даследчыкаў савецкага перыяду, прадметам вывучэння якіх сталі розныя бакі знешнепалітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – першай палове XVI ст. Зроблена выснова аб тым, што ў расійскай савецкай гістарыяграфіі была працягнута традыцыя вывучэння пытанняў знешнепалітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага скрозь прызму гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага. Пры гэтым не ўсім аспектам надавалася дастатковая ўвага, шэраг з іх характарызаваўся тэндэнцыйным асвятленнем.*
*Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае.*

*The article analyzes the most important works of Russian researchers of the Soviet period, the subject the study of which were of various aspects of the foreign policy history of the Grand Duchy of Lithuania in the end of the XIV – first half of the XVI centuries. It was concluded that in Russian Soviet historiography, the tradition of studying the issues of the foreign policy history of the Grand Duchy of Lithuania through the prism of the history of the Grand Duchy of Moscow was continued. At the same time, not all aspects were given sufficient attention, and a number of them were characterized by tendentious coverage.*
*Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania.*

Расійскую гістарыяграфію, прысвечаную вывучэнню разнастайных аспектаў знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у канцы XIV – першай палове XVI ст., умоўна можна падзяліць на дарэвалюцыйную, савецкую і сучасную. Акрамя храналагічнага моманту, падставай для выдзялення такіх складовых частак можа быць і сэнсавая напаўняючая. Гэта тлумачыцца тым, што ў працах расійскіх гісторыкаў у вызначаныя перыяды знайшлі адлюстраванне свае адмысловыя тэарэтычныя пабудовы, сюжэты, погляды, ацэнкі падзей і гістарычных асоб. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз важнейшых прац расійскіх даследчыкаў савецкага перыяду, прадметам вывучэння якіх сталі розныя бакі знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст.

Трэба адзначыць, што ў 1920-я гг. колькасць даследаванняў па гісторыі ВКЛ на тэрыторыі СССР значна скарацілася, а ў 1930–1940-я гг. яны амаль спыніліся. Аднак некаторыя аспекты знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ усё ж былі прадстаўлены ў работах расійскіх савецкіх гісторыкаў, працы якіх былі прысвечаны гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага, Рускага царства, а таксама шэрагу іншых сумежных дзяржаў і пабачылі свет пераважна ў 1950–1980-я гг.

Міжваенны перыяд не быў багаты на даследаванні па азначанай праблематыцы. Аднак у 1920–1930-я гг. медыявісты М. М. Пакроўскі [1], У. І. Пічэта [2; 3], У. В. Маўродзін [4; 5] прадставілі на старонках сваіх прац некаторыя знешнепалітычныя сюжэты з гісторыі ВКЛ з пункту гледжання марксісцкага падыходу да інтэрпрэтацыі гісторыі. Як адзначаў, напрыклад, У. В. Маўродзін, «Московское государство притягивало к себе забитый и угнетенный панами русский, украинский и белорусский народы» [5, с. 153]. Вывучэннем стасункаў паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім, а пазней Рускім царствам на Смаленскім кірунку займаўся ў гэты перыяд У. П. Мальцаў [6].

Асобнай увагі заслугоўвае праца М. М. Пакроўскага «Русская история в самом сжатом очерке», якая ў 1920-я гады выкарыстоўвалася ў якасці адзінага афіцыйнага падручніка па гісторыі і была запатрабавана аж да ліквідацыі так званай «школы Пакроўскага» [1]. У гэтай публікацыі гісторык асаблівую ўвагу надаў гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага, у тым ліку знешніх абставінаў, звязных з яго супрацьстаяннем з ВКЛ. Разам з тым, названая праца была пазбаўлена навуковага апарату, у ёй адсутнічалі спасылкі на крыніцы і спіс выкарыстанай літаратуры, назіраўся ненавуковы стыль выкладання матэрыялу, які выкарыстоўваўся з мэтай зрабіць тэкст працы зразумелым нават для малаадукаванага чалавека.

У 1950 г. было апублікавана даследаванне акадэмікаў Б. Д. Грэкава і А. Ю. Якубоўскага, прысвечанае гісторыі станаўлення, росквіту і падзення Залатой Арды [7]. Апошняя частка манаграфіі, асвятляючая падзеі заняпаду Залатой Арды, утрымлівала інфармацыю і па пытаннях кантактаў ВКЛ з ардынцамі, татарскім фактары ў знешняй палітыцы ВКЛ у часы кіравання вялікага князя літоўскага Вітаўта і пазней аж да часу распаду Залатой Арды. Праца мела пэўныя ідэалагічныя ўстаноўкі (як адзначалі самі аўтары, напісана яна была з марксісцка-ленінскіх пазіцый), аднак многія яе палажэнні не страцілі актуальнасці і ў нашы дні.

Шырокае кола пытанняў, закранаўшых пытанні знешняй палітыкі ВКЛ у другой палове XV – пачатку XVI ст., было разгледжана ў фундаментальным даследаванні К. В. Базілевіча, якое, нягледзячы на час свайго напісання, канец 1940 – пачатак 1950-х гг., было заснавана на крытычным аналізе крыніц і адлюстроўвала ў цэлым аб'ектыўную карціну знешняй палітыкі Вялікага Княства Маскоўскага ў другой палове XV – пачатку XVI ст. і ў тым

ліку яе ўзаемаадносінаў з ВКЛ [8]. У сваёй працы гісторык акцэнтаваў увагу на тым, што знешняя палітыка Вялікага Княства Маскоўскага ў разглядаемы перыяд знаходзілася ў цеснай узаемасувязі з палітыкай унутранай, асноўнай мэтай якой было стварэнне цэнтралізаванай дзяржавы. Разам з тым у працы К. В. Базілевіча знайшла адлюстраванне сістэма поглядаў на падзеі, якія прывялі да страты ВКЛ часткі ўсходніх зямель на карысць Вялікага Княства Маскоўскага ў канцы XV – пачатку XVI ст. Гэты працэс разумеўся наступным чынам: праваслаўнае насельніцтва ВКЛ ужо ў XV ст. пакутавала ад прыгнёту каталіцызму, таму імкнулася перайсці пад уладу Вялікага Княства Маскоўскага і на мяжы XV–XVI стст., дзякуючы паспяховым палітычным і ваенным крокам маскоўскіх манархаў, аб'ядналася з адзінавернымі братамі. Разам з тым наяўнасць у кнізе К. В. Базілевіча шэрагу недастаткова абгрунтаваных палажэнняў не пазбаўляе яе ў цэлым высокай навуковай каштоўнасці. Яна да нашых дзён застаецца найбольш грунтоўным даследаваннем знешняй палітыкі Вялікага Княства Маскоўскага ў часы кіравання Івана III, уключаючы кантакты з ВКЛ, а таксама ўзаемаадносіны абедзвюх дзяржаў з Лівонскай канфедэрацыяй, Перакопскай і Вялікай Ордамі, Польшчай і Малдаўскім Княствам. Пры аналізе стасункаў ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім на мяжы XV–XVI стст. важнае месца ў працы заняла характарыстыка спецыфічных рысаў шлюбнай дыпламатыі дзяржаў як зброі ў палітычнай барацьбе. Аўтар па сутнасці раскрыў прычыны таго, чаму шлюб вялікага князя літоўскага Аляксандра (католіка па веравызнанні) з маскоўскай князёўнай Аленай Іванаўнай (праваслаўнай) стаў апошнім у шэрагу традыцыйных да таго часу дынастычных шлюбаў літоўскіх манархаў з рускімі князёўнамі.

У другой палове XX ст. выйшаў шэраг прац абагульняючага характару аўтарства расійскіх гісторыкаў, на старонках якіх развіваліся сюжэтныя лініі аб спецыфіцы міжнародных кантактаў ВКЛ з краінамі Еўропы. Пры гэтым погляд на ўзаемаадносіны ВКЛ з еўрапейскімі дзяржавамі прадстаўляўся скрозь прызму гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага, а пазней і Рускага царства. Указаная акалічнасць была ўласціва працам Г. Л. Харашкевіч [9], І. Б. Грэкава [10], А. А. Зіміна [11; 12], У. Д. Каралюка [13], Ю. Я. Івоніна [14], М. М. Ціхамірава [15] і інш.

І. Б. Грэкаў на аснове комплекснага аналізу міжнароднага становішча, якое склалася ва Усходняй Еўропе ў XIV–XVI стст., зрабіў выснову пра трансфармацыю ролі ВКЛ у гэтым рэгіёне. Да ліку галоўных фактараў, якія прывялі да паражэння польскага караля і вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелончыка у барацьбе з вялікім князем маскоўскім Іванам III, гісторык адносіў наяўнасць у ВКЛ нацыянальных і рэлігійных супярэчнасцей [10, с. 175].

Абставіны і змест канфліктаў ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім падрабязна былі разгледжаны ў працах А. А. Зіміна «Россия на рубе-

же XV–XVI столетий» [12] і «Россия на пороге Нового времени» [11]. У іх ён працягваў развіваць тэзіс дарэвалюцыйных расійскіх гісторыкаў аб тым, што галоўнай праблемай у стасунсках паміж суседзямі заставаліся тэрытарыяльныя спрэчкі. Гэта тлумачылася тым, што першараднай задачай знешняй палітыкі маскоўскіх вялікіх князёў на мяжы XV–XVI стст. было вяртанне «рускіх зямель» (гэта значыць зямель, населеных пераважна праваслаўным насельніцтвам), частка з якіх у той час знаходзілася і ў складзе ВКЛ [11, с. 75].

Іншага пункту гледжання прытрымліваўся У. Д. Каралюк. Ён меркаваў, што ў эпоху кіравання Івана ІІІ у Вялікага Княства Маскоўскага сфарміраваліся некалькі асноўных знешнепалітычных задач: на ўсходзе – барацьба з татарскімі ханствамі, на захадзе – барацьба са злучанымі ўніяй ВКЛ і Польшчай, на паўночным захадзе – змаганне са Швецыяй і Лівонскім ордэнам. Рэалізацыю гэтых задач працягнуў Іван IV [13, с. 149].

Манаграфія Г. Л. Харашкевіч вылучалася сваёй шматпланавасцю і значнай крыніцазнаўчай базай [9]. У тэксце можна вызначыць некалькі сэнсавых пластоў, аб’яднаных тэматыкай палітычных, эканамічных, культурных сувязей Вялікага Княства Маскоўскага з еўрапейскімі краінамі, у тым ліку ВКЛ. Прааналізаваўшы даступныя ёй крыніцы, аўтар прыйшла да высновы, што да 30-х гг. XVI ст. Руская дзяржава стала лідарам ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне і цэнтрам прыцягнення праваслаўных жыхароў ВКЛ [9, с. 86, 88].

Побач з сінтэтычнымі працамі абагульняючага характару з-пад пяра расійскіх гісторыкаў пасляваеннага перыяду выйшаў і шэраг даследаванняў, у якіх асвятляліся калізіі літоўска-рускіх, літоўска-малдаўскіх і літоўска-татарскіх узаемаадносінаў. Даследаванню дыпламатычных кантактаў паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у другой палове XV – пачатку XVI ст. была прысвечана дысертацыя М. Я. Арцёмава [16]. Для яе была характэрна апалагетыка войнаў паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і ВКЛ барацьбой за ўз’яднанне спрадвечна рускіх зямель, якія раней уваходзілі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. Таксама ў ёй гучаў тэзіс пра рэлігійны прыгнёт у ВКЛ праваслаўнага насельніцтва, якое з-за ўціску імкнулася да пераходу пад уладу Рускай дзяржавы. Такога меркавання прытрымліваліся таксама У. П. Мальцаў [6], К. В. Базілевіч [8] і Г. Л. Харашкевіч [9].

Перагляд склаўшыхся ў савецкай гістарыяграфіі меркаванняў пачаўся ў канцы 80-х гг. XX ст. Новы, якасна адрозны ад ранейшых, погляд на ВКЛ і яго адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім знайшоў адлюстраванне ў папулярным нарысе С. У. Думіна «Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское)» [17]. У ім упершыню ў савецкай гістарыяграфіі былі выказаны думкі, якія аспрэчвалі тэзіс пра прыцягненне славянскага насельніцтва ВКЛ да Рускай дзяржавы.

З канца XV ст. узрасла роля Малдаўскага Княства ў сістэме міжнародных кантактаў ВКЛ. У значнай ступені гэта было наступствам разрыву перса-

нальнай уніі, якая злучала ВКЛ з Польшчай пасля смерці Казіміра Ягелончыка ў 1492 г. Малдаўскае Княства, якое займала выгаднае геапалітычнае становішча, у той час лавіравала паміж дамаганнямі Польшчы, Венгрыі і Асманскай імперыі, якія імкнуліся ўстанавіць над ім свой сюзерэнітэт. Суседства з Асманскай імперыяй і жаданне выйсці з-пад уплыву Ягелонаў прадвызначылі збліжэнне Малдаўскага Княства з Вялікім Княствам Маскоўскім, адным з галоўных праціўнікаў апошніх. Тагачасны вялікі князь літоўскі Аляксандр з'яўляўся зяцем вялікага князя маскоўскага Івана III і імкнуўся наладзіць добразычлівыя адносіны з саюзнікам апошняга, малдаўскім гаспадаром Стэфанам. Вывучэнню ўзаемаадносінаў паміж названымі вышэй дзяржавамі былі прысвечаны працы савецкіх даследчыкаў Л. Я. Сямёнавай [18, 19], М. А. Мохава [20], У. Д. Каралюка [13]. У даследаваннях гэтых аўтараў можна адзначыць імкненне да адлюстравання падзей з малдаўскіх пазіцый. Да ліку агульных рысаў, уласцівых працам пералічаных аўтараў, можна аднесці замоўчванне існавання мірных узаемаадносінаў паміж ВКЛ, Польшчай і Малдаўскім Княствам. Азначаная акалічнасць тлумачылася жаданнем падкрэсліць дапамогу Вялікага Княства Маскоўскага Малдаўскаму Княству ў барацьбе апошняга за незалежнасць ад Польшчы, Венгрыі і Асманскай імперыі ў другой палове XV ст. У гэты ж час быў прадстаўлены погляд на маскоўска-малдаўскія кантакты як заканамерны, стваральны, прагрэсіўны ход падзей. Пры паказе ж адносінаў Малдавіі з ВКЛ і Польшчай абсалютызавалася роля канфліктных фактараў.

Не засталіся ў баку сюжэты знешняй палітыкі ВКЛ і ў працах, якія былі прысвечаныя адлюстраванню ўзаемаадносінаў Вялікага Княства Маскоўскага з Крымскім ханствам і Асманскай імперыяй. Дадзеная праблематыка раскрывалася ў працах М. А. Смірнова [21], І. Б. Грэкава [10], У. Д. Каралюка [13], Б. М. Флоры [22], А. Б. Кузняцова [23].

Паколькі Крымскае ханства з 1475 г. было вымушана прызнаць сюзерэнітэт Асманскай імперыі, адным з дыскусійных пытанняў стала вызначэнне ступені самастойнасці знешнепаітычных крокаў крымскіх ханаў. У сувязі з гэтым частка даследчыкаў (І. Б. Грэкаў [10], А. Б. Кузняцоў [23], М. А. Смірноў [21]) выказвала меркаванне, што Крымскае ханства было толькі інструментам правядзення палітыкі Асманскай імперыі ва Усходняй Еўропе. Прыхільнікі іншага пункту гледжання (А. А. Зімін [11] і Г. Л. Харашкевіч [9]) лічылі, што Крымскае ханства было самастойным ў ажыццяўленні ўласнай знешняй палітыкі, якая часта ўступала ў супярэчнасці з інтарэсамі Асманскай імперыі.

Такім чынам, у расійскай савецкай гістарыяграфіі назіралася тэндэнцыя вывучэння пытанняў знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ скрозь прызму гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага. Пры гэтым не ўсім аспектам надавалася дастатковая ўвага. Савецкіх гісторыкаў мала цікавілі пытанні фарміравання ідэалагічных сродкаў і ажыццяўлення з іх дапамогай знеш-

непалітычных задач. Трэба адзначыць, што не ўсе пытанні разглядаліся даследчыкамі аб'ектыўна і для шэрагу з іх было характэрна тэндэнцыйнае асвятленне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Покровский, М. Н.* Русская история в самом сжатом очерке / М. Н. Покровский. – Москва: Издательство ЦК ВКП(б) Партиздат, 1933. – 544 с.

2. *Пичета, В. И.* Белоруссия и Литва XV–XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития) / В. И. Пичета. – Москва: Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 788 с.

3. *Пичета, В. И.* Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Белоруссии / В. И. Пичета. – Москва: Соцэкгиз, 1940. – 135 с.

4. *Мавродин, В. В.* Образование единого русского государства / В. В. Мавродин. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1951. – 328 с.

5. *Мавродин, В. В.* Образование русского национального государства / В. В. Мавродин. – М.-Л.: Государственное социально-экономическое издательство, 1939. – 195 с.

6. *Мальцев, В. П.* Борьба за Смоленск (XVI–XVII вв.) / В. П. Мальцев. – Смоленск: Смоленское обл. гос. изд., 1940. – 346 с.

7. *Греков, Б. Д.* Золотая Орда и ее падение / Б. Д. Греков, А. Ю. Якубовкий. – Москва: Изд-во АН СССР, 1950. – 479 с.

8. *Базилевич, К. В.* Внешняя политика Русского централизованного государства: Вторая половина XV в. / К. В. Базилевич. – Москва: Издательство Московского ун-та, 1952. – 554 с.

9. *Хорошкевич, А. Л.* Русское государство в системе международных отношений / А. Л. Хорошкевич. – Москва: Наука, 1980. – 292 с.

10. *Греков, И. Б.* Очерки по истории международных отношений Восточной Европы в XIV–XVI вв. / И. Б. Греков. – Москва: Восточная литература, 1963. – 380 с.

11. *Зимин, А. А.* Россия на пороге Нового времени / А. А. Зимин. – Москва: Мысль,1972. – 452 с.

12. *Зимин, А. А.* Россия на рубеже XV–XVI ст. / А. А. Зимин. – Москва: Мысль, 1982. – 333 с.

13. *Королюк, В. Д.* Турецкая феодальная агрессия в страны Юго-Восточной и Центральной Европы и формирование многонациональной Дунайской монархии (XVI–XVII вв.) / В. Д. Королюк // Юго-Восточная Европа в эпоху феодализма: рез. докл. Кишинев. симп. 1973 г. / Акад. наук СССР [и др.]; под ред. В. Д. Королюка, П. В. Советова. – Кишинев: Штиинца, 1973. – 199 с. – С. 142–149.

14. *Ивонин, Ю. Е.* У истоков европейской дипломатии нового времени / Ю. Е. Ивонин. – Минск: Университетское, 1984. – 160 с.

15. *Тихомиров, М. Н.* Исторические связи России со славянскими странами и Византией / М. Н. Тихомиров. – Москва: Наука, 1969. – 374 с.

16. *Артемов, Н. Е.* Московско-литовские дипломатические отношения при Иване III: автореф. дис. … канд. ист. наук / Н. Е. Артемов. – Ташкент, 1950. – 10 с.

17. *Думин, С. В.* Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское) / С. В. Думин // История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории России IX–XX вв. / сост.: С. В. Мироненко. – Москва: Политиздат, 1991. – С. 76–126.

18. *Семенова, Л. Е.* Из истории молдавско-польско-турецких отношений конца XV в. / Л. Е. Семенова // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. / под ред. Б. А. Рыбакова. – Москва: Наука, 1979. – С. 40–52.

19. *Семенова, Л. Е.* Некоторые аспекты международного положения Молдавского княжества во второй половине XV в. // Юго-Восточная Европа в средние века / сборник. ред. кол.: чл-кор. АН СССР Я. С. Гросул. – Кишинев: Штиинца, 1972. – 375 с. − С. 225–234.

20. *Мохов, Н. А.* Молдавия эпохи феодализма / Н. А. Мохов. – Кишинев: Картя молдовеняскэ, 1964. – 440 с.

21. *Смирнов, Н. А.* Россия и Турция в XVI–XVII вв.: в 2 т. / Н. А. Смирнов. – Москва: Изд. Моск. ун-та, 1946. – Т. 1: XVI век. – 158 с.

22. *Флоря, Б. Н.* Проект антитурецкой коалиции середины XVI в. / Б. Н. Флоря // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв.: сб. ст. / Акад. наук СССР [и др.]; под ред. Б. А. Рыбакова. – Москва: Наука, 1979. – 392 с. – С. 71–86.

23. *Кузнецов, А. Б.* Россия и политика Крыма в Восточной Европе в первой трети XVI в. / А. Б. Кузнецов // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв.: сб. ст. / Акад. наук СССР [и др.]; под ред. Б. А. Рыбакова. – Москва: Наука, 1979. – 392 с. – С. 62–70.

**(Дата подачи: 21.02.2025 г.)**